## Асаблівасці назоўнікаў 3-га скланення

1. Па зычным тыпе скланяюцца назоўнікі mater, tris *f* — *маці*; pater, tris *m* — *бацька*; frater, tris *m* — *брат*; juvĕnis, is *m*, *f* — *юнак*, *дзяўчына*; parens, entis *m*, *f* — *бацька*, *маці*; canis, is *m* — *сабака*.

2. Назоўнікі sitis, is *f* — *смага*; puppis, is *f* — *кармá*; turris, is *f* — *вежа*; febris, is *f* — *ліхаманка*; secūris, is *f* — *сякера*, а таксама назвы рэк і гарадоў на **-is** (напрыклад, Tibĕris, is *m* — *Тыбр*; Neapŏlis, is *f* — *Неапаль*) маюць у *acc. sg.* канчатак **-im**, у *abl. sg.* канчатак **-i**.

3. Назоўнікі navis, is *f* — *карабель*; classis, is *f* — *флот* могуць мець у *acc. sg.* канчатак **-im**, у *abl. sg.* канчатак **-i**; назоўнікі ignis, is *m* — *агонь*, imber, bris *m* — *дождж* могуць мець у *abl. sg.* канчатак **-i**.

4. Назоўнік bos, bovis *m*, *f* — *бык*, *карова* скланяецца наступным чынам:

| Склон | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| *Nom.* | bos | boves |
| *Gen.* | bovis | boum |
| *Dat.* | bovi | bobus, bubus |
| *Acc.* | bovem | boves |
| *Abl.* | bove | bobus, bubus |
| *Voc.* | bos | boves |

5. Назоўнік Juppĭter, Jovis *m* — *Юпітэр* скланяецца наступным чынам:

| Склон | Singulāris |
|---|---|
| *Nom.* | Juppĭter |
| *Gen.* | Jovis |
| *Dat.* | Jovi |
| *Acc.* | Jovem |
| *Abl.* | Jove |
| *Voc.* | Juppĭter |

6. Назоўнік vis *f* — *сіла*, *моц* скланяецца наступным чынам:

| Склон | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| *Nom.* | vis | vires |
| *Gen.* | — | virium |
| *Dat.* | — | virĭbus |
| *Acc.* | vim | vires |
| *Abl.* | vi | virĭbus |
| *Voc.* | vis | vires |

7. Назоўнік vas, vasis *n* — *пасудзіна, сасуд* скланяецца наступным чынам:

| Склон | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| *Nom.* | vas | vasa |
| *Gen.* | vasis | vasōrum |
| *Dat.* | vasi | vasis |
| *Acc.* | vas | vasa |
| *Abl.* | vase | vasis |
| *Voc.* | vas | vasa |